# “Шчасце селяніна – у любімай справе”



Моцна прывязаны душою і сэрцам да родных мясцін Генадзь Старасвецкі. Усе яго самыя найлепшыя ўспаміны звязаны з Батаеўшчынай. Некалі Генадзь сам вучыўся ў Веткаўскай сярэдняй школе. Зараз тут жа выкладае чарчэнне, асновы бяспекі жыцця, працоўнае навучанне, дапрызыўную падрыхтоўку.

Трэба прызнацца, што размаўляць з Г.В. Старасвецкім – адно задавальненне. Жыццё гэтага чалавека вельмі багатае на цікавыя здарэнні. Узгадаць хаця б тое, што служыць Генадзю Віктаравічу давялося на Паўночным флоце ў горадзе Відзяева (Мурманская вобласць) мараком-падводнікам. Перад гэтым юнак з Веткі ў тагачасным Ленінградзе (цяпер - Санкт-Пецярбург) на працягу паўгода асвойваў азы спецыяльнасці “тарпедны электрык” у вучэбным атрадзе.

Трохгадовая служба загартавала характер Генадзя. Вясковы жыхар і зараз многія жыццёвыя цяжкасці, перашкоды стараецца ўспрымаць цярпліва, нават, з усмешкай. Калі сталы і дужы хлопец зноў трапіў за парту ў Аршанскае педвучылішча, паступіў у якое ён яшчэ да арміі, многія выкладчыкі не пазналі свайго навучэнца. Другім стаў Г.В. Старасвецкі не толькі знешне, але і змяніўся яго светапогляд.

Пасля заканчэння сярэдняй спецыяльнай навучальнай ўстановы Генадзь па размеркаванню быў накіраваны ў вёску Іўкіна ў пачатковую школу.

Праз нейкі час ініцыятыўнага і майстравога селяніна заўважыў старшыня калгаса “Прагрэс” Уладзімір Канавалаў. Так Г.В. Старасвецкі ўзначаліў будаўнічую галіну ў мясцовай гаспадарцы. У вёсках пачалі з’яўляцца новыя прыгожыя домікі. Аднак, толькі на гэтым справа не стала. Разам з дальнабачным Уладзімірам Венедыктавічам Генадзь змог ажыццявіць самыя смелыя і неверагодныя задумы: пабудаваць каўбасны цэх і, нават, звераферму. Менавіта Г.В. Старасвецкі ў незабыўны для Батаеўшчыны час прывёз з Латвіі, станок для абразання рагоў у аленяў.

Потым Генадзь уладкаваўся на працу ў Веткаўскую СШ (там жа і яго жонка Святлана выкладае фізіку і матэматыку). Вясковыя хлапчукі, якія змалку прывыклі займацца нечым карысным, вельмі прывязаліся да крэатыўнага настаўніка. Я сам падчас размовы з Генадзем Віктаравічам стаў

відавочцам таго, што вучні, нават, на перапынках спяшаюцца ў сталярню, каб нешта памайстраваць. Вядома ж моцная дзіцячая зацікаўленасць дрэваапрацоўкай ўзнікла не на пустым месцы, а на наглядных прыкладах.



Дзякуючы намаганням Г. В. Старасвецкага школьны дворык зараз упрыгожваюць дэкаратыўныя грыбкі, вялізны лебедзь-альтанка і іншыя цікавыя вырабы. Хутка непрыкметны куточак пад лесніцай запоўніць арыгінальная кампазіцыя. Дзеля гэтай мэты ўжо зроблены драўляны бусел з важным выглядам, рублены калодзеж і плот.

Ды і што казаць, адзін толькі добраўпарадкаваны дом Генадзя Віктаравіча чаго стоіць. Усюды адчуваецца рука гаспадара.

Возера ў вёсцы Батаева аблюбавалі даўно не толькі мясцовыя жыхары, але і госці з райцэнтра. А ўлетку нешта невытлумачальнае вабіць туды людзей з розных куточкаў Беларусі і, нават, Расіі.



Калі рыбакоў (а рыбы ў возеры, кажуць, шмат) не адарве ад іх любімага занятку ні дождж, ні сцюжа, ні мароз, то звычайным адпачываючым патрэбны камфорт.

Таму і задумалі работнікі Батаеўскага сельсавета пабудаваць на пляжы зону адпачынку. Здзейсніць смелую мару ўзяўся народны ўмелец, настаўнік працоўнага навучання Веткаўскага ВПК “Дзіцячы сад - сярэдняя школа”, Генадзь Старасвецкі. У гэтага чалавека сапраўды залатыя рукі. Яго ўменне вырабляць розныя цуды з драўніны вядома далёка за межамі роднай вёскі.

Зараз пляж упрыгожваюць прасторная альтанка, арыгінальная лавачка, раздзявальня з падручных матэрыялаў. Усё атрымалася незвычайна і цудоўна.

Хто ведае, можа гэта добрая мясціна праз нейкі час стане адным з цэнтраў аграэкатурызма.

Дзіўна, але, нягледзячы на тое, што цікавае і карыснае захапленне Генадзя Віктаравіча займае шмат часу, ён яшчэ паспявае працаваць і дома. У

яго вялікая гаспадарка: карова, свінні, куры. На ўласным трактарку Г. В. Старасвецкі кожны год апрацоўвае 1 гектар раллі і 0,8 гектара луга пад сенакос. Ён і суседзям стараецца дапамагчы.

Генадзь Віктаравіч лічыць, што здольнасці яму генетычна перадаліся ад дзеда Цімоха, які ў свой час рабіў вельмі якасныя самапрадкі і куфары.



Таксама натхнёны вясковец цікавіцца тэхнікай. Калісьці даўно ён зрабіў светамузыку, а ў савецкі час гэта быў піск моды. Так, увечары ў сельскім клубе пад запальныя рытмы танцавальнай музыкі міргалі расфарбаваныя трактарныя фары.

А нядаўна Генадзь удасканаліў апарат для апрыскавання каларадскіх жукоў, зрабіў больш зручным такарны станок.

Калі патрэбна, Г.В. Старасвецкі можа і сарай зрубіць альбо лазню. Зарабляць грошы пры дапамозе пілы і сякеры ён навучыў і трох сваіх сыноў.

Напрыканцы нашай гутаркі я зразумеў, што суразмоўца мой ніколі не прападзе, якія б сацыяльныя перамены не напаткаліся на яго жыццёвым шляху. Дабрабыт гэтага сумленнага чалавека цалкам залежыць ад уласнай карыснай і стваральнай працы.

*Уладзімір ПАЎЛЮЧЭНКА.*
*На здымках: Генадзь Старасвецкі і яго работы.*

**Паўлючэнка, У.** "Шчасце селяніна – у любімай справе" : аб захапленнях Генадзя Старасвецкага / Уладзімір Паўлючэнка // Шлях Кастрычніка. — 2009. — 12 снежня. — С. 3.